# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
17 лістапада
1994 года
№ 11(1716)


# ВІНШУЕМ З ДНЁМ СТУДЭНТА!

● ЧАЛАВЕК ПЕРШАЙ ПАЛАСЫ

## «ПАВІНЕН ПРАЦАВАЦЬ МЕХАНІЗМ, ЯКІ ДАПАМОЖА СТУДЭНТУ АДЧУЦЬ СВАЮ САЦЫЯЛЬНУЮ АБАРОНЕНАСЦЬ»

*Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» прадстаўляе новага прарэктара БДУ па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях дацэнта Сяргея Васільевіча РАШЭТНІКАВА.*



**— Сяргей Васільевіч, да пасады прарэктара Вы ўзначальвалі кафедру паліталогіі...**

— Так. І па сёння ўзначальваю яе, выкладаю паліталогію. Дарэчы, праз два месяцы — абарона маёй доктарскай. Ведаеце, паліталогія ў нашай рэспубліцы — навука маладая. Я вывучаў заходні вопыт, у прыватнасці, Польшчы і Злучаных Штатаў Амерыкі. Тэма працы — «Аналіз працэсу прыняцця палітычных рашэнняў у палітычнай навуцы ЗША». Для нас вельмі важна вывучаць вопыт іншых краін дзеля развіцця дэмакратыі і палітычнай навукі на Беларусі. Палітолагаў для нашай рэспублікі рыхтуе ўжо трэці год толькі БДУ — на юрыдычным факультэце на аддзяленне паліталогіі ў гэтым годзе пры наборы 25 чалавек быў конкурс больш за чатыры чалавекі на месца.

**— Сяргей Васільевіч, акрамя вучэбнай работы Вы непасрэдна будзеце займацца і сацыяльнай сферай. Як Вы гэта сабе ўяўляеце?**

— Я думаю, што неабходна распрацаваць спецыяльнае палажэнне па вучэбна-выхаваўчай рабоце і быту студэнтаў. Галоўнае — стварыць для студэнтаў сацыяльна спрыяльныя ўмовы, патрэбна навесці парадак і ў інтэрнатах. Павінен працаваць механізм, які дапаможа студэнту адчуць сваю сацыяльную абароненасць.

**— Сяргей Васільевіч, Вы, напэўна, памятаеце свае студэнцкія гады... Вы скончылі наш універсітэт?**

— Не. Я вучыўся ў Гродне. Але жыву і працую ў Мінску ўжо амаль 20 гадоў...

**— Прабачце, калі ласка, а колькі Вам гадоў?**

— Ужо 45.

**— Цяпер стала модным абавязкова цікавіцца гараскопам...**

— Ведаеце, я нарадзіўся на мяжы: 22 ліпеня — Рак па гараскопу, але 23 ліпеня — ужо Леў.

**— У Вас ёсць жонка, дзеці?**

— Так. Мая жонка Святлана Іванаўна — намеснік загадчыка аддзела арганізацыйнай работы Цэнтральнага універсама Мінска. Дзве дачкі: малодшая Ніна — у другім класе, старэйшая Таццяна — у чацвёртым.

**— Сяргей Васільевіч, ці ёсць у Вас захапленні, якія засталіся са студэнцкіх гадоў?**

— Так. Амаль кожны дзень я прачынаюся ў 6 гадзін раніцы і бегаю, займаюся спортам. У свой час я тры разы быў чэмпіёнам рэспублікі па боксу сярод студэнтаў.

**— Вельмі цікава. Магчыма, Вы яшчэ і спяваеце?..**

— І спяваю. Але цяпер толькі для сябе і сваіх сяброў. Калісьці скончыў музычную школу, іграў на баяне, на гітары — навучыўся сам.

**— А якія песні Вы спяваеце?**

— Люблю фальклор. Спяваю па-руску, па-беларуску, па-польску, па-ангельску...

**— Сяргей Васільевіч, у Вас ёсць якая-небудзь любімая страва?**

— Так. Я і сам люблю гатаваць. Мая фірменная страва — дранікі з мясам.

**— А дзе Вы любіце адпачываць?**

— Мне заўсёды прыемна ездзіць дадому, да бацькоў, у свой родны горад Гродна.

**— Вялікі дзякуй за прыемную гутарку. Я думаю, студэнты знойдуць у Вашай асобе сапраўднага абаронцу сваіх інтарэсаў.**

**Гутарку вяла АНАСТАСІЯ К.**

● СВЯТКАВАННІ

## У ГЕАФАКА — ЮБІЛЕЙ!

У 1994 годзе спаўняецца 60 гадоў з дня заснавання ў Белдзяржуніверсітэце геаграфічнага факультэта (першапачаткова ён называўся геолага-глебава-геаграфічным). Гэта свята ўсіх беларускіх географаў, бо большасць з іх — выхаванцы геафака. Тут фарміраваліся нацыянальныя кадры географаў, развіваўся і рос талент многіх вучоных, нараджаліся навуковыя напрамкі.

Сёння факультэт — буйнейшы ў рэспубліцы вучэбна-навуковы цэнтр. У складзе факультэта 7 кафедраў, 5 навукова-даследчых лабараторый, музей землязнаўства, 18 вучэбных лабараторый і кабінетаў, чытальная зала геаграфічных навук, вучэбна-геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна» і Браслаўская лімналагічная станцыя. Тут вучыцца звыш тысячы студэнтаў, больш за 30 аспірантаў і саіскальнікаў, педагагічную і навуковую работу на факультэце вядуць звыш 100 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Сярод іх — 14 дактароў навук прафесараў, 40 дацэнтаў, больш за 15 старшых навуковых супрацоўнікаў.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па фізічнай і эканамічнай геаграфіі, рацыянальнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў і ахове прыроды, краязнаўству і методыцы арганізацыі турысцка-экскурсійнай справы, геамарфалогіі, картаграфіі, гідралогіі сушы, метэаралогіі і кліматалогіі; геаграфіі глебаў, зямельных рэсурсаў і меліярацыі; рэгіянальнаму планаванню і кіраванню гаспадаркай, дэмаграфіі і інш. З 1994 г. пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях — «Геалогія» і «Экалогія». Нягледзячы на тое, што асноўнае прызначэнне факультэта — падрыхтоўка спецыялістаў-географаў для сярэдніх школ, вышэйшых навучальных і навуковых устаноў, выпускнікі геафака паспяхова працуюць у геалагічных, глебавых, землеўпарадкавальных, меліярацыйных і гідраметэаралагічных службах, тапографа-картаграфічных установах, у дарожна-будаўнічых, даследчых эканамічных арганізацыях, у экскурсійных бюро, на турбазах і ў многіх іншых установах і арганізацыях краіны.

Сярод выпускнікоў факультэта амаль 30 дактароў навук, прафесараў. Больш за 200 выпускнікоў сталі кандыдатамі навук. З гонарам нясуць сваю працоўную вахту настаўнікі-географы. Больш чым 40 выхаванцам геафака прысвоена ганаровае званне Заслужанага настаўніка рэспублікі.

Пры факультэце дзейнічае спецыялізаваны савет па абароне дысертацый, на якім абаронена 10 доктарскіх і звыш 150 кандыдацкіх дысертацый. Супрацоўнікамі факультэта апублікавана звыш 200 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для ВНУ і сярэдніх школ, манаграфіі па геолага-геаграфічных навуках.

Геаграфічны факультэт — буйны навуковы цэнтр. Большасць дзяржбюджэтных і гаспадарча-дагаварных тэм выконваюцца па важнейшай актуальнай тэматыцы. Навуковыя даследаванні на факультэце каардынуюцца Рэспубліканскімі навукова-тэхнічнымі праграмамі «Ахова прыроды» і «Ліквідацыя вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС», праграмамі АН Беларусі «Прыродакарыстанне» і «Суверэнітэт». З кожным годам выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі факультэта ўсё шырэй прыцягваюцца да навуковых экалагічных экспертыз, праектаў рацыянальнага прыродакарыстання.

У пасляваенны перыяд на факультэце ўтварылася некалькі навуковых школ. Прафесарам В. А. Дзяменцьевым створаны новы напрамак ландшафтнай геаграфіі. Распрацаваныя схемы фізіка-геаграфічнага раяніравання і састаўлена ландшафтная карта Беларусі. Напісаны манаграфіі, адна з якіх (аўтары В. П. Якушка, Г. І. Марцынкевіч і інш.) удастоена Прэміі Дзяржаўнага камітэта СССР па народнай адукацыі. Яшчэ ў 50-х гадах акадэмік АН Беларусі І. С. Лупіновіч і член-карэспандэнт АН Беларусі А. Р. Мядзведзеў паклалі пачатак школе географаў-глебазнаўцаў. Распрацавана методыка якаснай ацэнкі зямель Беларусі, аўтар якой А. Р. Мядзведзеў атрымаў прэмію імя акадэміка Вільямса. Зараз на кафедры глебазнаўства і геалогіі і ў навукова-даследчай лабараторыі экалогіі ландшафтаў распрацоўваюцца новыя навуковыя напрамкі — меліяратыўная геаграфія (прафесар В. С. Аношка) і геахімія ландшафтаў (прафесар М. К. Чартко), вывучаецца ўздзеянне асушальных меліярацый на глебы, раслінасць і мікраклімат, распрацоўваюцца прыёмы аптымізацыі ўрадлівасці меліяраваных глебаў. У канцы 60-х гадоў пачалі паспяхова развівацца даследаванні пад кіраўніцтвам

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства; рыторыкі і методыкі выкладання славянскіх моў і літаратур; прыкладной лінгвістыкі;**

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: радыёфізікі; інфарматыкі; раманскіх і класічных моў; англійскай мовы гуманітарных факультэтаў; нямецкай мовы; фізіялогіі чалавека і жывёл; паліталогіі; гісторыі журналістыкі і літаратуры; беларусазнаўства; гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу; сацыялогіі;**

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскіх і класічных моў; англійскай мовы гуманітарных факультэтаў; нямецкай мовы; англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;**

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных факультэтаў; нямецкай мовы; грамадзянскага права; міжнароднага права; псіхалогіі;**

**АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ фізіялогіі чалавека і жывёл.**

**Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220050, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.**

**Аб'ява надрукавана ў газеце «Беларускі універсітэт» 17 лістапада 1994 года.**

## САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА

**ЛЕПШУЮ НАВУКОВУЮ РАБОТУ СЯРОД МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА**

Конкурс праводзіцца па чатырох секцыях:
— матэматычныя і фізіка-тэхнічныя навукі;
— хімія, біялогія, геаграфія;
— гісторыка-філасофскія і эканамічныя навукі, права;
— філалогія, журналістыка, псіхалогія і педагогіка.

Для пераможцаў конкурсу ў кожнай секцыі прадугледжваецца адна прэмія памерам мінімальнай заработнай платы на момант правядзення конкурсу.

**ПРАВЯДЗЕННЕ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ (НДР) МАЛАДЫМІ ВУЧОНЫМІ**

Тэмы НДР, якія вылучаюцца на гэты конкурс, павінны мець бясспрэчную актуальнасць, выконвацца па прыярытэтных накірунках навукі (гуманітарных альбо прыродазнаўчанавуковых), уяўляць тэарэтычную і практычную каштоўнасць.

Фінансаванне НДР (дзве на 1995—1996 гады), вызначаных конкурсам, ажыццяўляецца з фондаў універсітэта тэрмінам на два гады.

Перамога ў гэтым конкурсе — добрая магчымасць для рэалізацыі вашых ідэй і самасцвярджэння ў навуцы. Так лічаць пераможцы прайшоўшых конкурсаў. У гэтым зможаце ўпэўніцца і вы, калі будзеце ўдзельнічаць у нашым конкурсе.

Мы зычым вам перамогі!

Узрост удзельнікаў абодвух конкурсаў абмежаваны 35 гадамі. Апошні тэрмін падачы заяў 30 снежня 1994 года.

За дадатковай інфармацыяй звяртайцеся да старшыняў саветаў маладых вучоных (СМВ) факультэтаў ці да старшыні СМВ БДУ дацэнта І. Г. Ганчаронка (тэл. 26-57-47).

● НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

# Справаздача рэктара БДУ Фёдара Мікалаевіча Капуцкага

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах «БУ» за 20 кастрычніка і 4 лістапада г. г.)*

Мы думаем, што вырашэнню гэтай, а таксама іншых праблем у галіне міжнароднай палітыкі нашай навучальнай установы будзе спрыяць стварэнне Каардынацыйнай Рады па міжнароднаму супрацоўніцтву, якая ўжо пачала сваю дзейнасць.

У 1993—1994 навучальным годзе адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта вырашыла комплекс задач па забеспячэнню навучальна-выхаваўчага працэсу, падтрыманню ў нармальным стане будынкаў, якія знаходзяцца на балансе універсітэта, своечасовага іх рамонту, утварэнню спрыяльных сацыяльна-бытавых умоў для жыцця і вучобы студэнтаў.

Асаблівая ўвага надавалася ўмацаванню і пашырэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы, назапашванню матэрыяльных рэсурсаў з улікам патрэб факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў універсітэта.

Аб'ектыўныя цяжкасці, узніклыя ў ходзе эканамічнай рэформы, нястрымны рост цэн на энерганосьбіты, матэрыялы і гатовыя вырабы, пастаянныя перабоі ў фінансаванні праводзімых мерапрыемстваў ускладняюць працу АГЧ.

Аднак, нягледзячы на цяжкасці і недахопы ў рабоце, у цэлым выконваюцца планы капітальнага і бягучага рамонту. Здавальняюча вырашаюцца пытанні эксплуатацыі будынкаў навучальных карпусоў, інтэрнатаў і іншых збудаванняў універсітэта. Ажыццяўляюцца, хаця і з вялікай напругай, перавозкі грузаў і пасажыраў. Вядзецца пастаянная работа па захаванню маёмасці і матэрыялаў, якія знаходзяцца ў службовых, жылых і складскіх памяшканнях універсітэта. Планавыя мерапрыемствы па абслугоўванню і рамонту будынкаў на працягу года праводзіліся ў асноўным пабочнымі падраднымі арганізацыямі, а таксама сіламі комплексных брыгад АГЧ.

У цяперашні час на балансе універсітэта знаходзіцца звыш 60 будынкаў і пабудоў, у тым ліку 9 інтэрнатаў, 15 навучальных карпусоў, больш за 35 іншых аб'ектаў агульнай плошчай 234448 кв. м. Многія з гэтых будынкаў эксплуатуюцца на працягу доўгага часу і патрабуюць капітальнага рамонту і рэканструкцыі. На канітальны рамонт за восем месяцаў гэтага года выдзелена 93,64 млн. рублёў (пры гадавым заданні 93 млн. рублёў).

Улічваючы дрэнны стан дахаў будынкаў, якія эксплуатуюцца доўгі час без капітальнага рамонту, службай эксплуатацыі будынкаў ажыццёўлены рамонт дахаў сталовых інтэрната № 5, корпуса па вул. Маскоўскай, 15, а таксама боксаў гаража універсітэта.

Выкананы вялікі аб'ём работ па стварэнню і рамонту сталярных вырабаў хімічнага факультэта і інтэрната № 7. Вырашэнне гэтай праблемы стала магчымым у сувязі са стварэннем добрай вучэбна-вытворчай базы універсітэта ў Шчомысліцы, дзе сёння функцыянуюць сталярны цэх, складскія і падсобныя памяшканні. Маецца рэальная магчымасць для пашырэння запасаў матэрыяльных рэсурсаў, забеспячэння іх нармальнага захоўвання.

Ажыццёўлена рэканструкцыя і рамонт інжынерных сетак каналізацыі і водазабеспячэння фізічнага корпусу, інтэрнатаў № 2 і № 4.

Планамерна вырашаюцца задачы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння ў рамках бюджэтных сродкаў, якія выдзелены на гэтыя мэты. За восем месяцаў бягучага году набыта маёмасці і матэрыялаў на суму 337,3 млн. рублёў. Гэта дазволіла забяспечыць усім неабходным навучальныя карпусы і інтэрнаты універсітэта да пачатку навучальнага года.

У 1993-94 навучальным годзе гараж універсітэта са сваімі задачамі ў асноўным справіўся, хаця рабіць гэта па вядомых прычынах усё цяжэй. У 1994 г. машынны парк гаража папоўніўся аднoй аўтамашынай ІЖ-2715 і складаецца зараз з 39 адзінак аўтатранспартных сродкаў. Больш 15 маюць прабег звыш 100 тыс. км. Наяўнасць вялікай колькасці састарэлых мадэляў аўтатранспартных сродкаў, адсутнасць катрольна-тэхнічнага пункту з абсталяваннем для праверкі працаздольнасці і рамонту вузлоў і агрэгатаў аўтамабіляў, дыягнастычнай апаратуры і запасных частак не дазваляюць у поўнай меры выкарыстоўваць магчымасці гаража і прыводзяць да вымушаных пpастояў аўтамабільнай тэхнікі.

На працягу года пэўная ўвага надавалася арганізацыі і паляпшэнню службы аховы карпусоў і другіх аб'ектаў універсітэта. Неабходнасць гэтай працы выклікана павелічэннем выпадкаў крадзяжу матэрыяльных каштоўнасцяў і маёмасці са службовых памяшканняў. Патрабуюцца дзейсныя меры па ўзмацненню прапускнога рэжыму, дадатковыя сродкі па аплаце працы вартаўнікоў, гаспадарча-абслугоўваючага персаналу.

У мэтах забеспячэння патрэбнага парадку ў інтэрнатах павышаны патрабаванні да пражываючых у іх студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Засяленне ў інтэрнаты праводзіцца з афармленнем актаў матэрыяльнай адказнасці, што дазваляе некалькі знізіць колькасць крадзяжоў і паломак мэблі, другой маёмасці па віне жыхароў; у цяперашніх цяжкіх умовах дырэкцыі студгарадка, камендантам вучэбных карпусоў і загадчыкам інтэрнатаў неабходна падтрымліваць больш цесны кантакт з дэканамі факультэтаў, з прафкамам студэнтаў па ўзмацненню выхаваўчай работы, патрабаваць ад студэнтаў беражлівых адносін да матэрыяльных каштоўнасцяў і падтрымання парадку.

Шмат што будзе зменьвацца у нашай рабоце па падрыхтоўцы спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. Канцэпцыя развіцця універсітэцкай адукацыі вылучае на першы план неабходнасць здзяйснення сур'ёзных і даўно наспелых змен у яе структуры і змесце. За сваю асноўную задачу гэтыя змены маюць удасканаленне навучальнага працэсу ў шырокім сэнсе гэтага паняцця, павышэнне ўзроўню універсітэцкай адукацыі і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

У цяперашніх сацыяльна-эканамічных абставінах, якія непазбежна штурхаюць да зніжэння вартасці вышэйшай адукацыі, у тым ліку і універсітэцкай, адной з надзвычай важных задачаў становіцца ўздым прэстыжу універсітэцкай адукацыі і фармаванне ў студэнта адпаведнага ўзроўню матывацыі актыўнага творчага ўдзелу ў навукова-даследчай рабоце.

Неабходна ўзнавіць ролю універсітэтаў не толькі ў іпастасі навукова-адукацыйных, але і грамадска-культурных цэнтраў сваіх рэгіёнаў. У свой час менавіта універсітэты тым і адрозніваліся, што перыяд знаходжання чалавека ў іх быў парою яго далучэння да культуры.

Праблема падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце не павінна быць самаабмежаванай (акадэмічна абмежаванай). У вышэйшай адукацыі павінен прэваліраваць культурны аспект, бо толькі з адзінства духоўнага і дакладна пазнанага матэрыяльнага свету пачынаецца шматлікасць мажлівых жыццёвых шляхоў чалавека. Ад узроўню развіцця духоўнасці залежыць прастор патэнцыяльнага творча-навуковага поля самога чалавека. Культура — гэта дух самапазнання, самасвядомасці, руху. Менавіта адукаванасць і культура захоўваюць духоўнасць і маральныя прынцыпы грамадства, а сёння гэта як ніколі важна для нашага грамадства.

Гаворачы пра найбольш важныя напрамкі перспектыўнага развіцця універсітэта, хацеў бы закрануць толькі некаторыя з іх.

1. Праблемы матэрыяльнай стымуляцыі дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу. На сённяшні дзень яна з'яўляецца адной з самых хваравітых і важных. У БДУ выразна ўжо вызначыліся вельмі небяспечныя тэндэнцыі прамога і скрытага адтоку найбольш падрыхтаваных і кваліфікаваных спецыялістаў (асабліва ў галіне эканамічных спецыяльнасцей). Гэтыя працэсы трэба тэрмінова спыніць, выкарыстаць для гэтага ўсе наяўныя магчымасці (больш гібкія і эфектыўныя формы сумяшчальніцтва, выкарыстанне валютных сродкаў, далейшая і больш рашучая рацыяналізацыя кадравай структуры універсітэта). Рабіць гэта неабходна як мага хутчэй і рашуча яшчэ і таму, што БДУ ў гэтых адносінах выглядае яўна ў лепшым святле сярод такіх ВНУ, як Беларускі эканамічны універсітэт, Беларускі тэхнічны універсітэт і інш.

2. Праблема распрацоўкі і інтэнсіўнай рэалізацыі сучаснай сацыяльнай палітыкі ва універсітэце. Тут прынцыпова важна акцэнтаваць увагу на двух пытаннях:

а) стварэнне адпаведнай структуры, якая б ажыццяўляла распрацоўку мерапрыемстваў і кантроль за іх рэалізацыяй у галіне пазавучэбнай работы студэнтаў, і функцыяніраванне сістэмы, якая забяспечвае нармальнае вырашэнне жыллёва-бытавых праблем усіх, хто навучаецца ва універсітэце;

б) рэзкая актывізацыя на прынцыпова новай падставе камерцыйнай дзейнасці ва універсітэце. Для гэтага неабходна тэрмінова распрацаваць адпаведную праграму, галосна і адкрыта абмеркаваць яе на ўсіх узроўнях універсітэцкага калектыву і няўхільна яе рэалізоўваць, выкарыстоўваючы атрыманыя сродкі дзеля вырашэння найбольш прыярытэтных задач (захаванне высокіх якасных і прафесійных кандыдацый прафесарска-выкладчыцкага і навукова-даследчыцкага саставу супрацоўнікаў, развіццё найбольш перспектыўных напрамкаў у адукацыі і інш.). Вельмі важна, каб гэтыя новыя ініцыятывы былі шырока вядомы ў калектыве універсітэта, што дазволіць значна павысіць аўтарытэт кіраўніцтва.

Прадстаўляецца, што эфектыўная праца ў гэтым напрамку патрабуе дакладнага кіраўніцтва і каардынацыі на ўзроўні рэктарата. У сувязі з гэтым лічым мэтазгодным увесці пасаду прарэктара па сацыяльных пытаннях і камерцыйнай палітыцы. Увядзенне гэтай пасады дазволіць грунтоўна аптымізаваць складваецца на дадзены момант размеркаванне функцый у рэктарацe.

Вось некаторыя вынікі, праблемы і пытанні, якія я прывёў у сваёй справаздачы. Зразумела, што іх значна больш. У сваіх выступленнях вы мяне дапоўніце, глыбей расшырыце некаторыя з іх, знойдзеце новыя.

Наша асноўная задача — гэта падрыхтоўка кваліфікаваных, кампетэнтных, адукаваных і культурных спецыялістаў.

Тут нам трэба мяняць сам падыход да працэсу навучання, ад масавага навучання пераходзіць да навучання індывідуальнага, развіцця творчых здольнасцяў студэнтаў.

Другога шляху няма.

Патрабаванні павінны быць самыя высокія як да студэнтаў, так і выкладчыкаў. Ад студэнтаў, якія не здольны засвойваць універсітэцкі курс, нежадаючых вучыцца, трэба рашуча пазбаўляцца. Але і да прафесарска-выкладчыцкага саставу трэба таксама падыходзіць больш патрабавальна. Выкладчыкаў, працуючых без энтузіязма, без захаплення, а часам і без неабходнага сумлення, таксама шмат. Многія з іх захапляюцца заработкам, і студэнты ім замінаюць спакойна жыць. Такім выкладчыкам трэба дапамагчы знайсці іншае месца працы. Патрэбна больш напружаная праца па ўдасканаленню самога навучальнага працэсу, яго структуры, яго зместу, яго ідэалогіі. Увогуле гэта работа складаная і цяжкая. Але гэта работа наша і нам яе патрэбна выконваць.

ЯРЫ ДА ГАЛАВЫ

# ПРАГРАМА «РАСІЙСКІЯ ГРАМАДСКІЯ НАВУКІ: НОВАЯ ПЕРСПЕКТЫВА»

Другі конкурс навуковых праектаў (1994—1995 гг.)

Маскоўскае аддзяленне Расійскага навуковага фонду пры падтрымцы амерыканскага Фонду Форда, пачынаючы з 1993 г., праводзіць конкурсы навуковых праектаў у галіне гуманітарных навук сярод маладых навукоўцаў Расіі і іншых рэспублік былога СССР. Першы конкурс навуковых праектаў «Расійскія грамадскія навукі: новая перспектыва» праводзіўся па трох дысцыплінах: паліталогіі, сацыялогіі і эканоміцы. У маі 1994 г. па рашэнню Міжнароднага Экспертнага камітэта праграмы, у склад якога ўваходзяць 11 аўтарытэтных расійскіх і замежных навукоўцаў, было выдзелена 107 грантаў у памеры 2000 долараў ЗША на гадавыя даследаванні па лепшых з праектаў-заявак, якія паступіла 746. Арганізацыям, у якіх атрымальнікі грантаў вядуць даследаванні па сваіх праектах, прадастаўлена магчымасць набыцця замежнай і расійскай літаратуры (перыядычных выданняў, манаграфій, даведачнай літаратуры, вучэбных дапаможнікаў) на суму 200 долараў ЗША.

У верасні 1994 г. Маскоўскае аддзяленне Расійскага навуковага фонду абвясціла другі конкурс навуковых праектаў «Расійскія грамадскія навукі: новая перспектыва». На гэтым этапе ўпор робіцца ўжо на чатыры дысцыпліны: паліталогію, сацыялогію, эканоміку, а таксама гісторыю Расіі і гісторыю СССР XIX—XX стст. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца маладыя навукоўцы (ва ўзросце да 40 гадоў), якія ў цяперашні час працуюць у навуковых ці навучальных установах, з'яўляюцца аспірантамі вочнага і завочнага навучання або маюць стаж работы ў навуковых (навучальных) арганізацыях не менш за 5 гадоў.

На конкурс неабходна прадставіць наступныя дакументы:

— апісанне даследчага праекта (аб'ёмам 8—12 друкаваных старонак праз 2 інтэрвалы);

— анкету;

— рэкамендацыю ад кіраўніцтва ўстановы ці ад спецыялістаў ў галіне прапанаванага даследавання (1—1,5 стар.).

Усе дакументы павінны быць прадстаўленыя ў чатырох экземплярах. Нечытэльныя (сляпыя) экземпляры да разгляду не прымаюцца. Дакументы, прадстаўленыя на конкурс, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.

Апошні тэрмін падачы заяўкі на другі конкурс навуковых праектаў — 15 студзеня 1995 г. Заяўку накіроўваць на адрас: Россия, 101000, Москва, Центр, Почтамт, а/я 245. Московское отделение Российского научного фонда. Конкурс научных проектов.

Падрабязная інфармацыя аб праграме «Расійскія грамадскія навукі: новая перспектыва» рэгулярна публікуецца ў штотыднёвай газеце «Поиск». Аб выніках першага конкурсу чытайце № 23 ад 10—16 чэрвеня 1994 г. Умовы новага конкурсу і падрабязныя рэкамендацыі да складання заявак апублікаваныя ў №№ 33—34 ад 10—16 верасня 1994 г.; а таксама ў спецыяльнай брашуры, якая высылаецца бясплатна па Вашай просьбе.

Адрас фонда: 101000, Москва, Златоустинский пер., д. 8/7, комн. 21. Тел. (095) 206-8578, факс (095) 206-8573.

За больш падрабязнай інфармацыяй аб парадку і ўмовах удзелу ў конкурсе звяртайцеся ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт».

● СВЯТКАВАННІ

# У ГЕАФАКА — ЮБІЛЕЙ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

прафесара В. П. Якушка па возеразнаўству, а прафесарам В. М. Шырокавым і яго вучнямі прыводзяцца работы па вывучэнню вадасховішчаў. Даследавана каля 500 азёр і вадасховішчаў рэспублікі, прапанаваны шляхі іх рацыянальнага выкарыстання і аховы. Пачынаючы з 70-х гадоў, прафесарам В. А. Жучкевічам плённа вялася навукова-даследчая работа па тапаніміцы рэспублікі. Вывучэннем пытанняў развіцця і размяшчэння вытворчых сіл Беларусі, эканоміка-геаграфічных асаблівасцей і тэрытарыяльнай арганізацыі аграрна-прамысловых комплексаў Рэспублікі Беларусь, геаграфіі насельніцтва, дэмаграфічнага прагназавання, рацыянальнага выкарыстання прыроднарэсурснага патэнцыялу, працоўных рэсурсаў, рэкрэацыйных рэсурсаў, тэрытарыяльнай арганізацыі адпачынку, фарміравання турысцкіх комплексаў эфектыўна займаюцца супрацоўнікі эканоміка-геаграфічных кафедраў факультэта (загадчыкі кафедраў Л. В. Казлоўская і А. У. Тамашэвіч). З адкрыццём у сярэдзіне 80-х гадоў навукова-даследчых лабараторый па геалогіі пад кіраўніцтвам прафесара Л. А. Дземідовіча пачаліся даследаванні экалогіі літасферы, палеагеамарфалагічных і геахімічых праблем рацыянальнага выкарыстання мінеральных рэсурсаў. Супрацоўнікамі факультэта напісаны падручнікі па фізічнай і эканамічнай геаграфіі для сярэдняй і вышэйшай школы, састаўлена большасць карт для выдадзеных геаграфічных атласаў Беларусі.

Супрацоўнікамі факультэта толькі за 1970—1993 гг. апублікавана звыш 6000 навуковых работ, 95 манаграфій, звыш 120 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Географы факультэта падтрымліваюць сувязі з географамі шэрагу замежных краін. Гэтыя сувязі ажыццяўляюцца ў час навуковых экспедыцый, выканання сумесных навуковых распрацовак, чытання лекцый, выдання сумесных прац, удзелу ў міжнародных канферэнцыях, семінарах, сімпозіумах. У плане міжнароднага супрацоўніцтва выконваюцца работы з Сафійскім, Берлінскім, Варшаўскім, Сілезскім, Ягелонскім, Люблінскім і многімі іншымі універсітэтамі Заходняй Еўропы.

У сувязі з шасцідзесяцігоддзем факультэта хочацца выказаць вялікую падзяку былым дэканам факультэта М. Т. Раманоўскаму, І. І. Трухану, А. Н. Андрушчанку, якія ўнеслі вялікі ўклад у станаўленне і развіццё факультэта. Вялікае дзякуй нашым ветэранам-выкладчыкам факультэта, якія з'яўляюцца для нас мудрымі дарадцамі.

**Дэкан геаграфічнага факультэта прафесар Р. А. ЖМОЙДЗЯК.**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

*Рашэннем Вучонага савета Белдзяржуніверсітэта ад 31 кастрычніка 1994 года прэмія імя У. І. Пічэты прысуджана доктару юрыдычных навук, прафесару* ***ЮХО Іосіфу Аляксандравічу*** *за сукупнасць работ па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Прэмія імя А. Н. Сеўчанкі прысуджана акадэміку* ***ВАЛАДЗЬКО Леаніду Вікенцьевічу*** *(пасмяротна), доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару* ***КАМЯКУ Анатолію Іванавічу,*** *доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару* ***УМРЭЙКА Дзмітрыю Сцяпанавічу*** *за манаграфію «Уранілавыя злучэнні». Прэмію за лепшую навуковую работу студэнтаў у галіне сацыяльных і гуманітарных навук атрымала студэнтка факультэта журналістыкі* ***МУРАЛЁВА Любоў Віталье ўна*** *за работу «Крытыка-публіцыстычная спадчына М. І. Гарэцкага і асэнсаванне яе ў сучасным друку», а ў галіне прыродазнаўчых навук — студэнт хімічнага факультэта* ***ЛАБАРЭВІЧ Іван Іванавіч*** *за работу «Электрахімічныя працэсы ў нанаразмерных электродных сістэмах». Падрабязней аб лаурэатах і іх работах чытайце ў наступных нумарах газеты.*

## САМІ З ВУСАМІ



8—10 лістапада 1994 года ў галоўным корпусе Белдзяржуніверсітэта працавала выстава-продаж «Камп'ютэр у адукацыі», арганізатарам якой з'явіўся Фонд праграмных сродкаў, які працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце з кастрычніка 1991 года. Асноўная задача дзейнасці Фонду — пошук і сістэматызацыя праграмных сродкаў вучэбнага прызначэння, а мэта выставы — прадставіць новыя камп'ютэрныя тэхналогіі, створаныя распрацоўшчыкамі Белдзяржуніверсітэта і іншых ВНУ, прыцягнуць да іх увагу ВНУ, педагагічных кадраў краіны, сярэдніх школ і спецыяльных навучальных устаноў.

Выставу адкрыў намеснік першага прарэктара БДУ па інфарматыцы Варатніцкі Ф. І., які падкрэсліў значнасць БДУ як метадычнага цэнтра па камп'ютэрнай адукацыі ў вышэйшай і сярэдняй школе.

Акрамя Фонду праграмных сродкаў у выставе бралі ўдзел Мінскае вытворчае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі, завод па рамонту медыцынскай тэхнікі, Расійскі Фонд камп'ютэрных праграм, Галіновы фонд праграмных сродкаў Міністэрства адукацыі РБ, вучэбны цэнтр «Алгоритм», ТАА «Белхард», АТ «НИК». На выставе былі прадстаўлены электронныя ўстаноўскія тэлефонныя станцыі і камутатары для вучэбных устаноў, ліцэнзіёнfamous і сістэмныя праграмы, спецыяльная літаратура.

Фонд праграмных сродкаў прадставіў праграмы, разлічаныя на сярэднюю і вышэйшую школу, якія навучаюць і кантралююць па розных дысцыплінах: інфарматыка, матэматыка, фізіка, электратэхніка, медыцына, радыёэлектроніка, хімія, біялогія, грамадскія навукі, замежныя мовы, руская і беларуская мовы.

**Алеся Т.**

***Фотаздымкі***

***Аляксея СУПРУНА.***



## З ВУХА Ў ВУХА

# ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА КАРОСТУ

Кароста — заразнае захворванне скуры, якое выклікаецца каросльвым кляшчом. Заражэнне каростай адбываецца непасрэдна пры дакрананні да хворых, іх рэчаў, праз пасцельную і споднюю бялізну, вяхотку і г. д. Паміж дзяцей інфекцыя можа перадавацца праз цацкі.

Трапіўшы на скуру, каросьлівыя кляшчы хутка прабіраюцца ў яе і застаюцца ў ёй на працягу ўсяго свайго жыцця, якое доўжыцца каля 2-х месяцаў. Яны пастаянна прагрызаюць рагавы слой скуры, пасоўваючыся паралельна паверхні, і пакідаюць за сабой пакручастыя хады (да аднаго сантыметра ў даўжыню). У адным такім ходзе самка кляшча адкладае да 50 яек. Падлічана, што за тры месяцы з яек, адкладзеных адной самкай кляшча, з'яўляецца каля 150 млн. каросьлівых кляшчоў.

ПРЫКМЕТЫ КАРОСТЫ.

На месцы пранікнення кляшча ў скуру ўзнікае маленькі пухірок. Найбольш яўнай прыкметай каросты з'яўляецца моцны сверб, які асабліва ўзмацняецца ўвечары і ўначы, пасля таго, як хворы кладзецца ў ложак. Часцей за ўсё кароста шкодзіць міжпальцавыя складкі кісцей, бакавыя паверхні разгінальнай паверхні передплеччаў, локцевага сустава, вобласць падпахавых ямак, малочных залозаў, жывата (асабліва каля пупка), ягадзіцы, бёдры і галёнкі.

Моцны сверб, які суправаджае каросту, прыводзіць да раздзірання скуры, куды хворыя часта заносяць інфекцыю.

ПРАФІЛАКТЫКА КАРОСТЫ.

Хворы на каросту павінен быць ізаляваны ад навакольных, пазбягаць кантакту з членамі сям'і.

Пры з'яўленні свербу, асабліва які ўзмацняецца па начах, неабходна тэрмінова звярнуцца да доктара. Без лячэння хворыя на каросту пакутуюць доўгі час. Пры неакуратным лячэнні і асабліва пры самалячэнні захворванне часцей за ўсё ўзнаўляецца. Каб пазбегнуць паўтору каросты неабходна не толькі лячыць хворага, але і правесці дэзінфекцыю ўсіх рэчаў, якія былі ў карыстанні хворага.

Пасцельныя рэчы (матрац, коўдру і падушку) праветрываць на працягу сямі дзён, а пасля выбіць.

Хворым на каросту да поўнага іх выздараўлення забараняецца наведваць лазні, дзіцям — яслі, садкі, школы.

**Доктар 2-й гарадской клінічнай бальніцы І. М. ВАЛЫНЕЦ.**

# СТУДЭНТ І ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА. АРТЫКУЛ ДРУГІ

***У гэтым артыкуле мы працягваем размову аб фізічнай культуры і аб розных яе аспектах, звязаных з жыццём студэнтаў, іх інтарэсамі. Усе прыведзеныя даныя, нагадваем чытачу, мы выкладаем пасля матэматычнай апрацоўкі матэрыялаў анкетнага апытання студэнтаў нашага універсітэта.***

Усім рэспандэнтам было прапанавана выказаць сваё меркаванне аб агульным уплыве фізічнай культуры на фарміраванне асобы па 3-х узроўнях значнасці: «Вельмі важна», «Сярэдне», «Неістотна». Для ацэнкі гэтага агульнага ўплыву было выбрана 7 фактараў, якія характарызуюць сацыяльна-псіхалагічны і фізіялагічны статус чалавека. У табліцы ў працэнтных суадносінах прыводзіцца думка студэнтаў рознага полу, якія далі адзнаку «Вельмі важна» кожнаму фактару.

| Характарыстыкі асобы | Сярэдняя ацэнка | Ацэнка мужчын | Ацэнка дзяўчат |
|---|---|---|---|
| Разумовае развіццё | 10,5 | 14,4 | 7,2 |
| Умацаванне здароўя | 69,6 | 74,2 | 66,2 |
| Паляпшэнне целаскладу | 71,4 | 73,7 | 69,7 |
| Развіццё ўмення арганізоўваць сябе | 32,4 | 35,0 | 30,4 |
| Развіццё волі | 45,2 | 51,5 | 40,7 |
| Дасягненне больш высокіх поспехаў у жыцці | 16,8 | 21,3 | 13,5 |
| Павышэнне ўпэўненасці ў сабе | 40,6 | 49,6 | 34,0 |

Прагледзеўшы гэту табліцу, мы бачым, што студэнты адносна аб'ектыўна ацэньваюць уклад фізічнай культуры ў фармаванне асобы. На наш погляд, недастатковай прызнаецца значнасць фізічнай культуры ва ўмацаванні здароўя, ва ўдасканаленні самаарганізацыі, у развіцці волі. І зноў, на жаль, прадстаўніцы прыўкраснага полу больш скептычна настроены да фізічнай культуры, чым мужчыны.

Напрыклад, 21,3% студэнтаў выказваюць думку, што заняткі фізічнай культурай вельмі важныя для дасягнення больш высокіх поспехаў у жыцці. Такога ж пункту погляду прытрымліваюцца толькі 13,5% студэнтак.

Агульнавядомае сцверджанне старажытных грэкаў: рух — залог здароўя. Якія ж формы рухавай актыўнасці выкарыстоўваюць студэнты на працягу ўсяго года?

Выявілася, што рэгулярна ходзяць пешшу з мэтаў умацавання здароўя, павелічэння знаходжання на свежым паветры 63%.

Фізічнай працай дома займаюцца толькі 35% студэнтаў, затое танцамі — 47,2%. Тут, як і меркавалася, дзяўчаты апынуліся наперадзе: 60,6% з іх стараецца паболей часу выдзяляць на гэтую прывабную і, на думку навукоўцаў, карысную форму рухавай актыўнасці.

У турыстычных паходах час ад часу ўдзельнічаюць 18,4% студэнтаў, 25,0% катаюцца на веласіпедах, 9% займаюцца гімнастычнымі размінкамі, 14,5% — аэробікай. 14% студэнтаў трэніруюцца з абцяжарваннямі (гіры, гантэлі, трэнажоры), 14,5% студэнтаў захапляецца рыбнай лоўляй. 25% студэнтаў удзяляе ўвагу адной з традыцыйных на Беларусі форм баўлення вольнага часу (і здабычы ежы) — збору грыбоў. 21% мужчын і 13,5% дзяўчат займаюцца аздараўленчым бегам. Як бачым, многія студэнты разумеюць значнасць рухавай актыўнасці і ўдзяляюць ёй пэўную, праўда, не заўжды дастатковую, увагу.

Нас, аўтараў даследавання, вельмі цікавіла пытанне, што замінае студэнтам больш актыўна займацца фізкультурай, спортам. Рэспандэнтам былі прапанаваны на выбар такія адказы: здароўе і без таго добрае, адсутнасць цікаўнасці, адсутнасць упэўненасці, што гэта можа спатрэбіцца ў жыцці, недастатковае здароўе, адсутнасць кампаніі, спортзбудаванняў паблізу, боязь, што трэніроўкі перашкодзяць добра вучыцца, недахоп вольнага часу, няўменне яго правільна арганізаваць, адсутнасць секцый па віду спорту, які падабаецца.

Больш за ўсё студэнтаў, 63% (58,7% хлопцаў і 66,5% дзяўчат), выбралі найбольш псіхалагічна лёгка вытлумачальную прычыну — недахоп вольнага часу. На гэта звычайна спасылаецца большасць людзей, якія не ўмеюць яго рацыянальна размяркоўваць. 21,2% студэнтаў (14,5% мужчын і 26% дзяўчат) аказаліся дастаткова самакрытычнымі: яны назвалі такую прычыну, як слабая воля і няўменне арганізаваць сябе.

Адной з сур'ёзных прычын, на якую ўказвае 17,2% студэнтаў, з'яўляецца адсутнасць добрай кампаніі для сумесных фізкультурных заняткаў. На 4-м месцы аказаўся такі фактар, як адсутнасць цікаўнасці да фізічнай культуры. Яго назвалі 14,4% рэспандэнтаў (12% мужчын і 16% дзяўчат).

10% студэнтаў лічаць, што больш актыўна займацца ім замінае боязь, што гэта перашкодзіць вучобе. Дзіўна, што тут мужчыны аказаліся больш баязлівымі.




*Маляваў Опричь Кромешний.*

Немалая частка студэнтаў (7,5%) адной з прычын назвала адсутнасць ва універсітэце секцый па відах спорту, якія падабаюцца і якімі студэнты хацелі б займацца. Тут аб'ектыўна праяўляецца пэўны недахоп у нашым універсітэце спартыўных збудаванняў.

І ўсё ж такі мы пераканаліся, што студэнты глабальна ўвогуле разумеюць значнасць для чалавека фізічнай культуры. Так, толькі 3,5% апытаных заявілі, што не займаюцца больш актыўна таму, што няма ўпэўненасці, што гэта можа спатрэбіцца ў жыцці. Большасць кажа, што рэгулярна трэніравацца трэба. Але тут яскрава праяўляецца адзін з законаў жыццёвай псіхалогіі — неадпаведнасць вербальнага (выказанага) рэальнаму.

**С. МАКАРЭВІЧ,**
**заг. кафедры фізвыхавання, дацэнт.**
**У. РЭЙЗІН,**
**кандыдат педагагічных навук.**

# АПЕРАЦЫЯ «ПЕШАХОД»

Рост дарожна-транспартных здарэнняў адбываецца ў асноўным праз наезды на пешаходаў. Так, на працягу верасня 1994 года на дарогах Мінска адбылося 85 ДТЗ, з іх — 60 наездаў на пешаходаў. У выніку 11 чалавек загінулі, а 50 паранены. Прычыны ДТЗ розныя, але сярод іх выдзяляецца невыкананне Правіл дарожнага руху пешаходамі і вадзіцелямі. Умацаванне дысцыпліны на дарогах Мінска, актывізацыя работы па прафілактыцы дарожна-транспартнага траўматызму выклікала неабходнасць правядзення з 10 кастрычніка па 10 лістапада 1994 года аперацыі «Пешаход».

Актывізацыя работы па прафілактыцы дарожна-транспартнага траўматызму неабходныя і ў БДУ. Аб гэтым сведчыць здарэнне, якое адбылося 12 верасня са студэнткай універсітэта Валчок Наталляй Сяргееўнай. Парушыўшы ПДР, яна пераходзіла праспект газеты «Известия» з-за аўтамашыны і трапіла пад колы аўтатранспарту. У выніку ДТЗ дзяўчына атрымала траўму і была шпіталізавана.

За дзевяць месяцаў 1994 года ў Мінску адбылося 495 ДТЗ. Пры гэтым загінулі 55, паранены 557 чалавек. Па віне вадзіцеляў усіх відаў транспартных сродкаў адбылося 206 ДТЗ: загінулі 26, паранены 288 чалавек. У тым ліку ў нецвярозым стане — 53 ДТЗ. Па віне індывідуальных уладальнікаў — 136 ДТЗ: загінулі 15, паранены 190 чалавек. У тым ліку ў нецвярозым стане адбылося 47 ДТЗ: загінулі 6, паранены 59 чалавек.

Па віне вадзіцеляў, якія пакінулі месца аварыі, адбылося 38 ДТЗ. Пры гэтым загінулі 3, паранены 38 чалавек.

Па віне веласіпедыстаў адбылося 9 ДТЗ: паранены 11 чалавек.

Па віне пешаходаў утворана 238 ДТЗ. Пры гэтым загінулі 25, паранены 215 чалавек. У тым ліку ў нецвярозым стане былі ўдзельнікі 95 ДТЗ: загінулі 3, паранены 93 чалавекі.

З удзелам дзяцей адбылося 93 ДТЗ. Загінулі 5, паранены 94 чалавекі.

Паважаныя работнікі і студэнты БДУ! Памятайце, што парушэнне дысцыпліны на дарозе заканчваецца ў выніку сумна. Таму заўжды выконвайце Правілы дарожнага руху і стрымлівайце тых, хто спадзяецца, што для яго ўсё абыйдзецца ўдачна.

**Дзяржаўтаінспектар Маскоўскай ДАІ І. ЧУМАК**

